Вернісаж

МАГІЧНЫ РЭАЛІЗМ

ПРЫЦЯГНЕННЕ БЕЛАРУСКАСЦІ

У Нацыянальным мастацкім музеі распачалі працу дзве адметныя выстаўкі беларускіх творцаў. Старшыня Саюза мастакоў, узнагароджаны ў 2012 годзе медалём Францыска Скарыны, Рыгор СІТНІЦА прадставіў падборку сваіх графічных і жывапісных твораў пад агульнай назвай «Ток». Таксама цікава ўбачыць экспазіцыю «Душой адданы Беларусі» Яўгена Куліка — выдатнага творцы другой паловы XX стагоддзя.



З серыі Рыгора Сітніцы «Суб'ектыўная рэальнасць».

— Яўген Кулік — выдатнейшы мастак, патрыёт краіны, якіх няма болей. Ён, вядома, быў варты ўсялякіх узнагарод і званняў. Добра, што праходзіць выстаўка яго твораў. І добра, што сёння людзі памятаюць пра яго, — адзначае Рыгор Сітніца.

На выстаўцы «Душой адданы Беларусі» дэманструюцца работы, створаныя Яўгенам Куліком на працягу 1956—2001 гадоў, выкананыя ў розных тэхніках графікі: малюнак алоўкам і тушшу, пастэль, акварэль, лінарыты. Дыяпазон яго тэм і сюжэтаў надзвычай шырокі: гэта і зробленыя з натуры пранікнёныя пейзажныя замалёўкі цэркваў, курганоў, млыноў, і малюнкі-рэканструкцыі беларускіх замкаў, і вобразы беларускіх князёў, ваяроў Усяслава Чарадзея, Давыда Гарадзенскага, паўстанцаў 1863 года, асветнікаў Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага.

Прадстаўлены кніжныя ілюстрацыі Яўгена Куліка да «Слова пра паход Ігаравы» і паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Усе творы прасякнутыя агульнай стрыжнявой ідэяй, шчырым і адданым служэннем беларускаму адраджэнню, што з'яўлялася творчым крэда мастака на працягу ўсяго яго жыцця. «Спадчына Яўгена Куліка займае ганаровае месца сярод дасягненняў беларускага мастацтва другой паловы XX стагоддзя. Яго вялікі ўклад у абуджэнне і захаванне для нашчадкаў гістарычнай памяці бясспрэчны», — упэўнены арганізатары выстаўкі.

— Мы з Богам гаворым. І працуем на вечнасць, — заўважыў старшыня Саюза мастакоў у каментарыі карэспандэнту «Звязды». — Мы ўсведамляем, што пройдзе час, і тымі творамі, якія зроблены сёння нашымі мастакамі, нацыя будзе ганарыцца. Бо любая краіна ў свеце ганарыцца імёнамі сваіх мастакоў, пісьменнікаў, кампазітараў.

Ілюстрацыя Яўгена Куліка да паэмы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра».

Творчасці самога Рыгора Сітніцы і яго выстаўцы «Ток» таксама ўласцівы пільная ўвага да беларускіх нацыянальных каштоўнасцяў — гісторыі, этнаграфіі, фальклору — як неад'емных частак агульнаеўрапейскага культурнага кантэксту. Яго творчай манеры ўласцівая гіперрэалістычная трактоўка беларускіх матываў. Часта можна сказаць, што гэта гісторыя чалавека, але без самога чалавека. Напрыклад, напісаныя прыадчыненыя дзверы, якія нібы застылі ў чаканні, вельмі шмат могуць сведчыць пра таго, хто зазвычай праз іх праходзіў...

Творчы кірунак, у якім працуе Сітніца, можна назваць магічным рэалізмам. З аднаго боку, ён з фатаграфічнай дакладнасцю перадае абраныя аб'екты. А з іншага — нібы стварае новую, вобразна-сімвалічную рэчаіснасць. Мастак пераводзіць тое, што можа падавацца звычайным на першы погляд, у плоскасць асаблівага, звышнатуральнага ў сваёй мастацкай вобразнасці.

Выстаўка Рыгора Сітніцы будзе працаваць да 9 снежня. Экспазіцыю работ Яўгена Куліка можна будзе ўбачыць да 2 снежня.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

А ПЕСНІ ЯГО ЗАСТАЮЦЦА

(Развітальнае слова з Ігарам Лучанком)

У лістападзе апаў жыццёвы лісток Ігара Міхайлавіча Лучанка. Дагарэла яго Божая свечка, запаленая закаханымі бацькамі. Закончыўся зямны рай Сына Беларусі, слыннага кампазітара, Народнага артыста.

Мне пашчасціла пасябраваць з ім, увайсці ў свет яго творчасці, адчуць тонкую, ранімую, акрыленую душу Маэстра. Вынікам гэтага чалавечага разумення стала мая дакументальная аповесць «Басанож па зорках» — пра вядомага і невядомага Ігара Лучанка.

Крыху пазней кніга ўбачыла свет у перакладзе на рускую мову пад назвай «Мелодия души». Самай высокай ацэнкай сталі словы самога героя аповесці на сігнальным экзэмпляры: «Не верыцца, што гэта кніга ёсць... Дарагі Уладзімір Сцяпанавіч, не верыцца... Вялікі дзякуй за гісторыю маёй маці і майго бацькі...»

Не хацелася ставіць кропку ў кнізе, бо мой герой заўсёды быў малады душой і натхнёны, у жыццёвым і творчым палёце. Нястомна шукаў новыя мелодыі. І я задаў яму вельмі ж складаную задачу: «Прапануй, Ігар Міхайлавіч, чытачам сваіх восем самых лепшых песень, якія б маглі ўвайсці ў знакамітую актаву. Хай яны стануць тваімі пасланцамі ў новы век». Доўга ламаў галаву кампазітар. Песні, як дзеці, усе любімыя, усе жаданыя. І вось яго асабісты, строгі адбор: «Спадчына», «Мой родны кут», «Жураўлі на Палессе ляцяць», «Майскі вальс», «Алеся», «Вераніка», «Авэ Марыя», «Зачарованая мая».

Па маёй просьбе Ігар Міхайлавіч у канцы кнігі звярнуўся да сваіх чытачоў. Прыгожым почыркам, няспешна, з душэўнай адказнасцю ён напісаў:



– Хочацца верыць, што людзі мяне крыху ведаюць. Для гэтага я працаваў і працую шчыра і сумленна. Мне падабаюцца, што мае мелодыі спяваюць і прафесіяналы, і аматары.

Марыў, каб мая душа, якую я ўклаў у песні, хаця б нейкай часцінкай перадалася маім слухачам, тым, хто любіць народную мелодыю, тым, хто адчувае ў маіх песнях святло, надзею.

Буду шчаслівым, калі застануцца жыць хаця б адна ўдзе мае песні. Тады і я, кампазітар, буду жыць.

Да сустрэчы ў новым стагоддзі!

Ігар Лучанок

28 кастрычніка 2000 г.

г. Мінск.

Зусім нядаўна ўся Беларусь святкавала васьмідзесяцігоддзе вялікага кампазітара Ігара Міхайлавіча Лучанка. На маёй кнізе «Басанож па зорках» юбіляр напісаў усяго два словы: «Быць дабру!». Цяпер, калі горкая вестка прыйшла ў сэрца яго паклоннікаў, тыя развітальныя словы І. М. Лучанка гучаць як наказ: «Быць дабру нашаму роднаму куту. Быць дабру людзям нашай мілай Айчыны Беларусі. Быць дабру ўсім і кожнаму паасобку!»

Сваім жыццём, творчасцю, сваёй нястомнай, іскрыстай душой незабыўны Ігар Міхайлавіч Лучанок тварыў Дабро. За гэта яму нізкі паклон і вечная памяць. Ён шчыра заслужыў самую вялікую ўзнагароду — Жыццё пасля жыцця.

Уладзімір ЛІПСКІ.

ПРЫГОЖА ЖЫЦЬ

Вялікі тэатр пачынае падрыхтоўку да штогадовага навагодняга Балю

Адным днём я вырашыла прыбрацца ў вечаровы строй, каб пайсці на афіцыйны прыём, але на месцы выявілася, што некаторыя людзі прыйшлі ў світарах, а сяброўка арганізуе экскурсіі «пойдзем глядзець на Ірэніну сукенку». Калі хочацца, каб вашы прыгожыя ўбранні выглядалі арганічна, трэба браць кірунак на нашы нешматлікія балі, адзін з якіх штогод праводзіцца ў Вялікім тэатры оперы і балета 13 студзеня на Стары Новы год. Тут наведвальнікі трымаюцца строгага дрэс-коду: вечаровая ці бальная сукенка для жанчын і смокінг альбо элегантны касцюм для мужчын. Пачынаць рыхтавацца трэба ўжо зараз.

Наступны Вялікі навагодні Баль у тэатры пройдзе дзясяты раз. З лістапада тут — у фае бельэтажа — пачаліся танцавальныя рэпетыцыі, якія, як звычайна, могуць наведваць усе, хто набыў квіток на Баль. Рэпетыцыі спатрэбяцца, каб ведаць, куды ставіць нагу і ў які момант рабіць паварот — мерапрыемства мае на ўвазе старадаўнія танцы, якім трэба навучыцца. Прыём у групы навучання скончыцца 11 снежня, а 12 студзеня адбудзецца генеральная рэпетыцыя ўсіх неабходных рухаў пад акампанемент аркестра. Казка, карацей.

Можна меркаваць, што, як і ў мінулым годзе, 13 студзеня Вялікі тэатр оперы і балета ператворыцца ў шматгранную забаўляльную прастору. Апроч запрашэнняў на вальс, тут дакладна можна будзе атрымаць шэраг варыянтаў пабавіць час сярод калон, пілястраў і жырандоляў у прыгожых строях і побач з артыстамі Вялікага, якія выканаюць нешта для гасцей. Забавы на любы густ.

Такога кшталту «высакародны» (ці з адсылкай да былой высакароднасці) спосаб праводзіць вольны час у Беларусі прапануе лічаная колькасць пляцовак, якія, дарэчы, маюць пастаянных наведвальнікаў. Некаторыя рыхтуюцца да Балю за некалькі месяцаў і замаўляюць для візіту спецыяльныя строі.

Усё, як у старадаўнія часы, толькі ў 2019-м Баль у тэатры будзе крыху больш выключнай з'явай.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Нотны радок

У Мінску заспявае Хасэ Карэрас

Бясспрэчна вартае ў раскладзе сталічных канцэртаў

Сусветна вядомы оперны спявак Хасэ Карэрас, за спінай у якога бліскучая кар'ера, прэміі «Грэмі» і Classic Brit Awards, захворванне на лейкемію, абвяшчэнне завяршэння опернай кар'еры і вяртанне на сцэну, 25 лістапада з адзіным канцэртам выступіць у Мінску. У Палацы Рэспублікі ён заспявае пад акампанемент Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра, а дырыжорам стане маэстра Аркадзь Берын.

Зараз знакаміты тэнар — неяк ён сказаў, што больш за ўсё ў жыцці любіць спяваць, а ўсё астатняе мітусня, — пастаянна выступае з канцэртамі, на якіх выконвае неапалітанскія і іспанскія песні, балады, рамансы, эстрадныя песні, а таксама музыку амерыканскіх мюзіклаў. Такую праграму ён прадставіць і мінскім слухачам: падчас выступлення прагучаць вядомыя «Passione», «Гранада», «Вярніся ў Сарэнта» і іншыя кампазіцыі, а між вакальнымі нумарамі Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Беларусі будуць выконвацца шэдэўры Джузэпэ Вердзі, Джакама Пучыні і Гаэтана Даніцэці.

Узлёт Хасэ Карэраса быў імклівы: ад дэбюту ў оперы «Норма» да загалоўных партый у La Scala і Метраполітан-опера. Дарэчы, кар'ера спевака пачалася з лёгкай рукі Мансэрат Кабалье, якая казала: «Ён, безумоўна, геніяльны і мае рэдкае спалучэнне — голас, музыкальнасць, цэласнасць, працавітасць і ўзрушальная прыгажосць. Я шчаслівая, што першая заўважыла гэты брыльянт і дапамагла свету яго ўбачыць». Мансэрат Кабалье настаяла на тым, каб Карэраса запрасілі спяваць у оперы «Лукрэцыя Борджыа», дзе сама выконвала галоўную ролю.

Оперны рэпертуар спевака велізарны — больш за шэсцьдзясят опер, дыскаграфія Карэраса ўключае каля ста пяцідзесяці пласцінак. Аматары памятаюць канцэрты «Трох тэнараў» — Пласіда Дамінга, Лучана Паваро́ці і Хасэ Карэраса, што ў свой час выклікалі сапраўдны фурор і пасля першага выступлення ў Рыме ў 1990-м працягваліся больш за дзесяць гадоў.

У 1987 годзе саракагадоваму артысту быў пастаўлены дыягназ — вострая лейкемія, з-за якой ён стаў радзей выступаць у оперных спектаклях, а ў 2009-м нават абвясціў аб завяршэнні опернай кар'еры. Тым не менш знакаміты тэнар перамог хваробу і вярнуўся на сцэну, але частка яго даходаў ад канцэртаў з тых часоў паступае ў створаны ім фонд на даследаванні лейкеміі.

Хасэ Карэрас выступаў з вядомымі дырыжорамі Зубінам Мета, Клаўдзіа Абада, Рыкарда Муці. На мінскім канцэрце яго паплечнікам стане выхаванец беларускай музычнай школы, прызнаны на сусветнай музычнай арэне Аркадзь Берын — галоўны дырыжор International Symphony Orchestra of Germany, «найлепшы інтэрпрэтатар музыкі Пятра Чайкоўскага», былы выкладчык Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, што сёння жыве ў Германіі.

Элеанора СКУРАТАВА.